ПАДЗЕЯ

# НЕ ЗГАСАЕ ПАМЯЦЬ У РАДКАХ

**ЛІДА. Тэматычнае літаратурнае мерапрыемства раённага ўзроўню адбылося ў Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы напярэдадні 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Калектыў раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце» (кіраўнік паэт Уладзімір Глінін) прысвяціў сваю творчую імпрэзу гэтаму ўсенароднаму святу.**




7 мая ў галоўнай бібліятэцы Лідскага краю адбылася паэтычная сустрэча членаў аматарскага літаратурнага аб’яднання «Суквецце» са студэнтамі Лідскага каледжа ГрДУ імя Янкі Купалы. Прысвечанае 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне свята мастацкага слова склалі прачытаныя аўтарамі творы грамадзянскай і ваенна-патрыятычнай тэматыкі.

На сустрэчы гучалі вершы, прысвечаныя гераічнаму подзвігу воінаў Савецкай арміі, пераможцаў фашызму, якія заваявалі перамогу цаной свайго жыцця; мужнасці савецкіх мірных людзей, якія станавіліся ахвярамі вайны, прынялі безліч нечалавечых пакут ад фашысцкіх катаў, але выстаялі, стаўшы прыкладам сілы духу і волі. Усё гэта натхняе лідскіх творцаў.

Са сваімі вершамі на рускай і беларускай мовах перад моладдзю райцэнтра выступілі паэты Уладзімір Глінін, Людміла Русь, Вольга Верасняк, Людміла Краснадубская, Ганна Рэлікоўская, Ірына Маркевіч, Лілія Каранеўская, Ала Юшко. Слова паэтаў-землякоў атрымала водгук у сэрцах, а памяць пра трагічныя і гераічныя старонкі нашага мінулага, як нязгаснае полымя вечнага агню, будзе жыць у пранікнёных, кранальных, шчырых радках мясцовых аўтараў.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** члены Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце» (кіраўнік паэт Уладзімір Глінін) – удзельнікі паэтычнага свята да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Ліда, раённая бібліятэка імя Янкі Купалы. 7 мая 2025 года.




80 ГАДОЎ
ПЕРАМОГІ
1945–2025